*Наталля Петухова*

# СВЯТЫ КАЛЯНДАРНАГА ЦЫКЛА ЯК ФАКТАР ФАРМІРАВАННЯ ЭСТЭТЫЧНАГА ЎСПРЫМАННЯ ПРЫРОДЫ

У наш час усё большы маштаб набываюць тыя экалагічныя зрухі, якія, згодна з папярэджаннем вучоных, могуць прывесці да антрапалагічнай катастрофы, пагражаць існаванню цывілізацыі, у значнай ступені прадвызначыць знікненне чалавецтва. Здаецца, што перад такой пагрозай усе намаганні павінны скіравацца на выхаванне экалагічнай свядомасці ў дарослых і дзяцей, а не на фарміраванне спажывецкіх інстынктаў. Яны, гэтыя інстынкты, патрабуюць усё большага і большага задавальнення, штурхаюць чалавека да набыцця новых статусных рэчаў, разгортвання новых відаў вытворчасці, а гэта – знішчэнне прыродных рэсурсаў і самой прыроды. Менавіта таму праблема фарміравання экалагічнай культуры, складовай часткай якой з’яўляецца эстэтычнае ўспрыманне прыроды, павінна займаць важнае месца ў педагогіцы. Яна патрабуе глыбокага вывучэння не толькі на тэарэтычным узроўні, але і на ўзроўні практычнай арганізацыі работы з дзецьмі.

Педагагічны вопыт Г. П. Арловай, В. С Болбаса, Г. М. Волкава, Л. М. Гафаравай, С. І. Мургаевай, І. І. Ярыты і інш. сведчыць аб тым, што важным сродкам фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды з’яўляецца фальклор. Паэтычнае багацце яго твораў выступае ў якасці эстэтычнай рэальнасці, якая валодае значнымі патэнцыяльнымі магчымасцямі развіцця светаўспрымання і светаразумення кожнага чалавека. Мастацкія сюжэты, паэтычныя вобразы фальклору, якія ўвасабляюць міфалагічныя ўяўленні старажытных людзей, іх назіранні за прыродай і навакольным светам, выклікаюць у асобы глыбокія эстэтычныя пачуцці і перажыванні, фарміруюць уяўленне пра хараство беларускай прыроды і пра месца чалавека ў ёй. Педагагічны эксперымент аўтара артыкула адбыўся ў дзіцячых фальклорных калектывах «Сунічка» Цэнтра пазашкольнай работы «Кантакт» Цэнтральнага раёна г. Мінска і «Рамонак» Цэнтра пазашкольнай работы «Маяк» Ленінскага раёна г. Мінска, удзельнікі якіх займаюцца непасрэдным вывучэннем фальклорных твораў.

У выніку шматгадовай эксперыментальнай дзейнасці мы можам сцвярджаць, што асаблівае значэнне для фарміравання ў дзяцей эстэтычнага ўспрымання прыроды мае ўдзел у традыцыйных каляндарна-абрадавых святах, якія праводзяцца ў натуральных прыродна-ландшафтных умовах. Выкарыстанне менавіта такой формы работы ў педагагічнай практыцы фальклорных калектываў пашырае вопыт гарманічнага ўзаемадзеяння з рэальнымі аб’ектамі і з’явамі прыроды, садзейнічае засваенню мадэлей эстэтычных паводзінаў ў прыродным наваколлі. Спевы і танцы, гульні і карагоды паўстаюць не проста як аб’ект эстэтычнага ўспрымання і выканання, а як імпульс для разгортвання сюжэта, як пэўная мадэль, як эстэтычны ўзор паводзінаў у прыродным асяроддзі. Сінкрэтычнае

спалучэнне слоў, танцавальных рухаў, жэстаў і мімікі, разнастайнай палітры музычных інтанацый, гукаў і фарбаў прыроднага свету ствараюць умовы для найвышэйшага перажывання эстэтычных эмоцый і пачуццяў, нараджаюць пачуццё любові да прыроды і адказнасці за яе лёс. Назапашванне эстэтычных уражанняў, іх сістэматызацыя на рэпетыцыях значна актывізуюць мастацка-творчую дзейнасць выхаванцаў, пашыраюць іх эстэтычны вопыт, уплываюць на фарміраванне эстэтычных матываў паводзінаў.

На такіх мерапрыемствах дзеці знаёмяцца з творчасцю шматлікіх аматарскіх і вучэбных фальклорных калектываў, што робіць педагагічны працэс больш цікавым. Супрацоўніцтва з рознымі калектывамі стымулюе творчы працэс, нараджае ў выхаванцаў пачуцце значнасці і каштоўнасці ўласнай мастацка-творчай дзейнасці. Гэта пэўным чынам уплывае на характар успрымання і выканання твораў, якія захапляюць сваёй вобразнасцю, непаўторнасцю, яскравым каларытам, выклікаюць эстэтычнае суперажыванне. Гледачы-саўдзельнікі свята імкнуцца не толькі слухаць спевы гуртоў, але і актыўна падпяваць. Такое калектыўнае выкананне песень спрыяе іх творчай актывізацыі, у выніку чаго яны па-новаму асэнсоўваюць і ацэньваюць сілу эмацыянальнага ўздзеяння фальклору, якая ўзнікае падчас агульнага выканання твораў. Адна справа – бачыць, як гэта робяць іншыя, а другая – самому прыняць удзел у свяце. Так праз сумесную творчасць дзеці з вялікім задавальненнем, натхненнем і лёгкасцю засвойваюць нацыянальныя мастацкія традыцыі, глыбока пранікаюць у сутнасць фальклорных вытокаў. І ў гэтым сэнсе фальклор валодае неабмежаванымі магчымасцямі для праяўлення ініцыятывы, актыўнасці асобы, здольнай выкарыстаць успрыманне прыгожага для выпрацоўкі стымулу маральнага самаўдасканалення і духоўнага развіцця.

Вялікую цікавасць выхаванцаў выклікалі святы «Каляда, каляда, дай, баба, пірага» (Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы, г. Мінск), Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа, г. Мінск), «Масленіца – белы сыр» (Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту, пасёлак Азярцо Мінскай вобласці); «Гуканне вясны» (Цэнтральны дзіцячы парк імя М. Горкага, г. Мінск); «Юр’я» (Цэнтральны батанічны сад НАН Беларусі, г. Мінск); «Вялікдзень» (Цэнтр пазашкольнай работы «Кантакт», г. Мінск), «Зялёныя святкі» (Цэнтральны дзіцячы парк імя М. Горкага, г. Мінск); «Купалле» (Батанічны сад, мястэчка Варчына, Польшча), «Купальскі вечар» (Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту, пасёлак Азярцо Мінскай вобласці) і інш.

Перад кожным святам кіраўнікі і ўдзельнікі эксперыментальных калектываў рыхтуюць разгорнутыя паведамленні па вызначаных тэмах і неабходны для выканання музычны матэрыял.

На рэпетыцыях, прысвечаных святу «Каляда, каляда, дай, баба, пірага», дзеці разглядалі тэму «Каляды – свята зімовага сонцастаяння», развучвалі песні з розных фальклорна-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі: «Прыйшла

Каляда ўвечары» (вёска Ананчыцы Салігорскага раёна Мінскай вобласці), «А талды, талды, зарадзі, Божа» (вёска Янова Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці), «Го-го-го, каза» (вёска Тонеж Лельчыцкага раёна Гомельскай вобласці), «Ходзіло-блудыло сэмсот малойцэв» (вёска Клятная Пінскага раёна Брэсцкай вобласці), «Ой, у Кіяве, ніжэй каменя» (вёска Дывін Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці), «В Рожэство Хрыстово» (вёска Запясочча Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці), «Ой, учора з вечора» (вёска Запясочча Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці), «Добры вечар табе, пане-гаспадару» (вёска Морач Клецкага раёна Мінскай вобласці), удзельнічалі ў калядных гульнях «Яшчур» (Барысаўскі раён Мінскай вобласці) і «Жаніцьба Цярэшкі» (Віцебская вобласць).

У межах работы над святам «Масленіца – белы сыр» была разгледжана тэма «Масленічныя святкаванні», развучаны песні «На вуліцы дзеўкі гуляюць» з вёскі Толпіна Чашніцкага раёна Віцебскай вобласці, «Мы па жэрдаццы йдом» з вёскі Барталамееўка Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці.

Вялікая работа была праведзена падчас падрыхтоўкі абраду «Гуканне вясны». Дзеці разглядалі тэму «Традыцыі “Гукання вясны” на Беларусі», развучвалі песні «Агу, вясна, агу, красна» (вёска Букча Лельчыцкага раёна Гомельскай вобласці), «Вол бушуе, вясну чуе» (вёска Ананчыцы Салігорскага раёна Мінскай вобласці), «Вясна, вясна на калочку» (вёска Закальное Любанскага раёна Мінскай вобласці), «Вясняначка» (вёска Казацкія Балсуны Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці).

Падрыхтоўка абрадавага свята «Юр’я» патрабавала разгляду тэмы «Юр’е на двары – кароўку ў поле гані», вывучэння песень «Да мы Юр’я пачынаем» (вёска Ахонава Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці), «Юр’я, устань рана» (вёска Дуброва Пастаўскага раёна Віцебскай вобласці).

Да абрадавага свята «Вялікдзень» удзельнікі калектываў развучылі наступныя песні: «А ўжэ нідалечка краснае яечка» (вёска Пратасы Акцябрскага раёна Гомельскай вобласці), «Ой, ляцела пава» (вёска Гаць Акцябрскага раёна Гомельскай вобласці), «Хадзілі, блудзілі валачобнікі» (вёска Студзераўшчына Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці), «Вясна, вясна на вуліцы» і «Да каціласся кацёлачка» (вёска Закальное Любанскага раёна Мінскай вобласці).

Працуючы над абрадам «Зялёныя святкі», дзеці даведаліся, адкуль пайшлі назвы «Зяленыя святкі», «Сёмуха», «Тройца», «Зелянец», «Русальны тыдзень», «Граная нядзеля», развучылі песні «Ой, ты Тройца, што пасееш, той зародзіцца» (вёска Чамярын Пінскага раёна Брэсцкай вобласці), «Ой, бяроза белая» (вёска Раеўшчына Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці), «На гранавай нядзелі русалкі сядзелі» (вёска Закальное Любанскага раёна Мінскай вобласці), «Правяду, правяду русалачку да бору» (вёска Вялікі Бор Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці).

Рыхтуючыся да святкавання «Купалля» і «Купальскага вечара» выхаванцы рыхтавалі разгорнутыя паведамленні на тэму «Традыцыі святкавання Купалля ў Беларусі», знаёміліся з легендамі пра папараць-кветку і пра кветку Іван-ды-Мар’я, развучвалі песні «Купала, Купала, дзе ты прабувала» (вёска Багатырская Полацкага раёна Віцебскай вобласці), «Чаму барок не званок» (вёска Ухвішча Полацкага раёна Віцебскай вобласці), «Ішла Купалка сялом, сялом» (вёска Ухвішча Полацкага раёна Віцебскай вобласці).

Традыцыйныя побытавыя танцы «Кракавяк», «Полька», «На рэчаньку», «Падэспан», «Юрачка», «Лявоніха», гульні «Цяцерка», «Явар», «Падушачка» і іншыя развучваюцца да ўсіх святаў.

Асобна падкрэслім, што дзейнасць па мадэляванні каляндарных абрадаў у натуральным прыродным асяроддзі арганічна спалучаецца з выхаваннем ва ўдзельнікаў фальклорных калектываў ашчадных, беражлівых адносін да прыроды. Так, на «Масленіцу» удзельнікі калектываў на вогнішчы спальваюць старыя, зношаныя, сапсаваныя рэчы і смецце, на «Гуканне вясны» прыносяць загадзя падрыхтаваныя мучныя вырабы, якія потым разам са спевамі веснавых песень «Агу, вясна, агу, красна», «Жавароначкі, прыляціце» і іншымі падкідваюць угору і пакідаюць для першых веснавых птушак. Напярэдадні свята «Вялікдзень», у «Чысты чацвер» мэтазгодна прыбіраць тэрыторыю, наводзіць чысціню ў пакоі для заняткаў, на «Юр’я» – садзіць кветкі.

Пасля правядзення свята, на наступных рэпетыцыях, неабходна сістэматызаваць і абагульніць набыты вопыт. Асабліва важнае значэнне тут адыгрывае выкарыстанне рэфлексіўных метадаў (самаацэнкі, дыскусій), якія дазваляюць не толькі прааналізаваць назапашаны эстэтычны вопыт («Ці спадабалася свята?», «Якія былі памылкі?», «Якія ёсць прапановы?»), але і атрымаць неабходную для ўдасканалення далейшай працы калектыву зваротную сувязь з выхаванцамі. Публікацыя матэрыялаў у насценным друку, падрыхтоўка фотаздымкаў, правядзенне выніковай канферэнцыі дапамагаюць удзельнікам калектываў абмяняцца ўражаннямі, асэнсаваць назапашаны вопыт, абмеркаваць і крытычна ацаніць як уласную дзейнасць, так і дзейнасць іншых выканаўцаў, выказаць свае пажаданні і прапановы.